Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар
па вучэбнай рабоце БДУКМ
______________С.Л. Шпарло
“_07_” ___07_________2023 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_6-21-1_/эвуч.

**БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для ўсіх спецыяльнасцей універсітэта*

2023

Вучэбная праграма складзена на аснове прыкладных вучэбных планаў па спецыяльнасцях агульнай вышэйшай адукацыі, зацверджаных Першым намеснікам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь 18.01.2023, 30.01.2023, 27.02.2023, вучэбных планаў БДУКМ па спецыяльнасцях

**СКЛАДАЛЬНІК:**
*С.М.Тычына,* дацэнт кафедры беларускай і замежнай філалогіі установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат філалагічных навук

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*Н.В. Заяц,* дацэнт кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка", кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
*А.А. Жэлуновіч,* загадчык кафедры рускай мовы як замежнай установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*Кафедрай* беларускай і замежнай філалогіі установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 11 ад 28.06.2023);
*Прэзідыумам* навукова-метадычным саветам установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 7 ад 05.07.2023)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Модуль “Беларуская і сусветная літаратура” складаецца з двух вучэбных дысцыплін “Беларуская літаратура” і “Сусветная літаратура”. Дадзеная вучэбная праграма прызначана для вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Беларуская літаратура”.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Беларуская літаратура” спрыяе фарміраванню інтэлектуальна і эстэтычна развітай, культурнай асобы. У творах літаратуры, як і ў творах іншых відаў мастацтва, фальклору, помніках гісторыі і матэрыяльнай культуры адлюстравана багатае духоўнае жыццё народа, яго невычэрпны талент, высокія гуманістычныя ідэалы. Таму ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй творчага профілю вывучэнне літаратуры як аднаго з відаў мастацтва заўсёды застаецца актуальным. Пры выкладанні беларускай літаратуры як часткі сусветнай літаратуры ўлічваецца яе цесная сувязь з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі, такімі як “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”, “Культуралогія”, “Гісторыя Белапусі”, “Гісторыя мастацтваў”, “Філасофія” і інш. Беларускі літаратурны працэс разглядаецца ў праграме паслядоўна, ад старажытных часоў да сучаснасці. Для літаратурнага аналізу пададзены найбольш значныя і характэрныя для пэўных перыядаў творы.

*Мэта* выкладання вучэбнай дысцыпліны “Беларуская літаратура” – раскрыць адметнасць і шматстайнасць беларускага літаратурнага працэсу, даць уяўленне пра асноўныя этапы яго развіцця, мастацкія напрамкі, эвалюцыю метадаў, стыляў, жанраў, а таксама пра творчыя пошукі і дасягненні айчынных пісьменнікаў.

*Задачы* выкладання вучэбнай дысцыпліны:

– даць студэнтам веды аб змесце, заканамернасцях беларускага літаратурнага працэсу, аб яго цеснай сувязі з сусветнай літаратурай;

– пазнаёміць з літаратурнымі здабыткамі пісьменнікаў Беларусі;

– навучыць аналізаваць літаратурны твор;

– развіваць эстэтычны густ, адчуванне прыгожага ў жыцці і ў літаратуры;

– навучыць студэнтаў арыентавацца ў свеце мастацкіх з’яў;

– садзейнічаць развіццю моўнай культуры.

Вучэбная дысцыпліна “Беларуская літаратура” арыентавана на духоўнае ўзбагачэнне асобы, выпрацоўку маральна-эстэтычных ідэалаў, развіццё творчага і навуковага мыслення.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць*:

– месца і ролю мастацкай літаратуры ў культуралагічным кантэксце;

– спецыфіку мастацкай літаратуры як формы спасціжэння свету;

– сувязі і ўзаемаўплывы літаратуры з іншымі відамі мастацтва;

– агульныя заканамернасці, тэндэнцыі развіцця беларускай літаратуры;

– мастацка-светапоглядныя сістэмы, іх змест, існаванне на працягу часу;

– творчасць яркіх прадстаўнікоў кожнай з мастацкіх эпох;

*умець:*

– характарызаваць літаратурную эпоху і асноўныя этапы яе развіцця, літаратурныя напрамкі;

– вызначаць спецыфіку нацыянальнага літаратурнага працэсу;

– успрымаць літаратурны твор ва ўзаемасувязі гісторыі і сучаснасці;

– самастойна аналізаваць мастацкі твор і творчасць пісьменніка;

– выкарыстоўваць набытыя веды ў прафесійнай практыцы;

*валодаць:*

– метадамі культурна-гістарычнага аналізу літаратурнага працэсу;

– асноўнымі паняццямі і катэгорыямі мастацкай інтэрпрэтацыі твора.

Аб'ект вывучэння вучэбнай дысцыпліны – беларуская літаратура, класічная і сучасная. Прадмет – тэматыка, праблематыка, жанравая сістэма, стылі, паэтыка мовы мастацкіх твораў.

З ліку эфектыўных педагагічных метадаў і тэхналогій навучання, якія садзейнічаюць набыццю студэнтамі ведаў у галіне беларускага літаратуразнаўства і фарміраванні ў іх вопыту самастойнага вырашэння разнастайных філалагічных задач, вылучаюцца наступныя:

– тэхналогіі вучэбна-даследчыцкай дзейнасці;

– праектнае навучанне;

– модулевае навучанне;

– праблемнае навучанне;

– метад актывізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці;

– тлумачальна-ілюстратыўныя тэхналогіі навучання;

– метад уключанага назірання.

Засваенне вучэбнай вучэбнай дысцыпліны “Беларуская літаратура” павінна забяспечыць фарміраванне наступнай кампетэнцыі:

СК-4 аналізаваць літаратурныя творы, арыентавацца ў сусветным і айчынным літаратурных працэсах і супастаўляць іх з парадыгмай развіцця іншых відаў мастацтва.

У адпаведнасці з вучэбнымі планамі на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Беларуская літаратура” для студэнтаў спецыяльнасцей 6-05-0322-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць і 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны прадугледжана 220 гадзін, з якіх 116 гадзіны – аўдыторныя заняткі (64 гадзіны – лекцыі, 52 гадзіны – семінары). Форма прамежкавай атэстацыі студэнтаў – экзамен.

На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Беларуская літаратура” для студэнтаў спецыяльнасцей 6-05-0213-01 Мастацтвазнаўства, 6-05-0213-02 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, 6-05-0215-01 Музычная народная інструментальная творчасць, 6-05-0215-02 Музычнае

мастацтва эстрады, 6-05-0215-03 Харэаграфічнае мастацтва, 6-05-0215-04 Рэжысура прадстаўленняў і свят, 6-05-0215-05 Рэжысура тэатра, 6-05-0215-06 Акцёрскае мастацтва, 6-05-0215-08 Мастацтва народных спеваў, 6-05-0215-09 Харавая творчасць, 6-05-0215-10 Камп'ютарная музыка, 6-05-0215-11 Фальклор, 6-05-0314-02 Культуралогія, 6-05-0314-03 Сацыяльна-культурны менеджмент і камунікацыі, 6-05-1013-02 Сацыяльна-культурная дзейнасць усяго адведзена 90 гадзін, з якіх 42 гадзіны – аўдыторныя заняткі (30 гадзін – лекцыі, 12 гадзін – семінары). Форма прамежкавай атэстацыі студэнтаў – экзамен.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## УВОДЗІНЫ

Спецыфіка мастацкай формы пазнання рэчаіснасці. Месца літаратуры ў шэрагу відаў мастацтваў. Літаратура як інтэлектуальны від мастацтва. Беларуская літаратура як частка сусветнага літаратурнага працэсу. Нацыянальная спецыфіка айчыннай літаратуры, моманты агульнасці з літаратурамі розных краін і збліжэння на глебе культурнагістарычнага развіцця.

Змест і задачы вывучэння дысцыпліны. Перыядызацыя і характарыстыка асноўных этапаў развіцця беларускай літаратуры.

Нацыянальнае мастацтва слова і сусветны культурны вопыт. Міжнародныя літаратурныя сувязі і кантакты. Беларуская літаратура ў перакладах на іншыя мовы.

## ТЭМА 1. ЛІТАРАТУРА XI–XVI СТСТ.

Гісторыка-культурны феномен старажытнай беларускай літаратуры. Перадумовы ўзнікнення і асаблівасці развіцця, спецыфіка. Сацыякультурная, ідэалагічная, выхаваўчая функцыі літаратуры ў старажытнасці.

Літаратура Сярэднявечча і яе асаблівасці. Перакладная (Біблія, патрыстыка, апокрыфы, хронікі) і арыгінальная літаратура (агіяграфія, летапісанне, малітоўная паэзія і інш.). Багацце і разнастайнасць жанравых формаў. Літаратурны канон.

Культурна-асветніцкая дзейнасць Е. Полацкай. Вобраз асветніцы ў "Жыціі Еўфрасінні Полацкай", сучаснай літаратуры, беларускім выяўленчым мастацтве, скульптуры.

Мастацкая спадчына Кірылы Тураўскага (урачыстыя пропаведзі, каноны, прытчы, казанні і інш.). "Слова пра паход Ігаравы" як узор усходнеславянскага гераічнага эпасу. Гістарычная аснова сюжэта, ідэйны змест твора.

Асаблівасці летапіснага жанру. "Аповесць мінулых гадоў" і яе значэнне. Беларуска-літоўскае летапісанне. Сярэднявечны рыцарскі раман і яго ўплыў на развіццё беларускай літаратуры.

## ТЭМА 2. ЛІТАРАТУРА АДРАДЖЭННЯ І РЭФАРМАЦЫІ

Рэнесанс як культурна-гістарычны рух у еўрапейскіх краінах. Асаблівасці беларускай літаратуры эпохі Адраджэння.

Культуралагічнае значэнне выдавецкай, літаратурнай і асветніцкай дзейнасці Ф. Скарыны. Прадмовы і пасляслоўі.

Жанравая разнастайнасць эпічнай і лірычнай, рэлігійнай і свецкай паэзіі эпохі Адраджэння. Новалацінская (М. Гусоўскі "Песня пра зубра", Я.Вісліцкі "Пруская вайна"), польскамоўная (Ц. Базылік, М. Стрыйкоўскі і інш.), беларускамоўная (творы А. Рымшы) літаратура.

“Песня пра зубра” М. Гусоўскага: гісторыя стварэння, ідэйны змест, праблематыка, сістэма вобразаў.

Рэфармацыйная публіцыстыка, яе асаблівасці і жанравая разнастайнасць (“Катэхізіс” С. Буднага, “Прадмова” да Евангелля В. Цяпінскага, пасланні і лісты Л. Сапегі і інш.). Палемічная і гісторыка-мемуарная літаратура (“Прамова Мялешкі” ,“Лісты Ф. Кміта-Чарнабыльскага”, “Дыярыуш Ф. Еўлашоўскага” і інш.).

## ТЭМА 3. ЛІТАРАТУРА XVII – XVIII СТСТ.

Культурна-гістарычныя і палітычныя абставіны развіцця беларускай літаратуры XVII–XVIII стст. Барока і класіцызм як вядучыя мастацкія плыні гэтага часу. Ідэі эпохі Асветніцтва ў беларускай літаратуры.

Паэзія XVII–XVIII стст. Асветніцка-культурная і літаратурная дзейнасць С. Полацкага. Жанрава-тэматычная разнастайнасць і эксперымаенты з формай твораў. Любоўная лірыка Ф.У. Радзівіл. Шматжанравы характар паэзіі А. Нарушэвіча, Ю. Нямцэвіча, Ф. Карпінскага, М. Карыцкага і інш.

Гісторыка-мемуарная (“Баркулабаўская хроніка”, “Дыярыуш” А. Філіповіча і інш.), палемічная (“Трэнас” М. Сматрыцкага” і інш.), парадыйна-сатырычная (“Торба смеху” К. Жэры”, “Ліст да Абуховіча” і інш.) і аўтабіяграфічная (“Авантуры майго жыцця” С. Пільштыновай) проза.

Інтэрмедыя як жанр, яе змест і сістэма вобразаў (“Селянін і студэнт”, “Селянін у касцёле” і інш.). Праблематыка школьнай драматургіі (М. Цяцерскі “Доктар па прымусу”, К. Марашэўскі “Камедыя”). Прыдворны (творчасць Ф.У. Радзівіл) і народны (батлейка) тэатр.

## ТЭМА 4. ЛІТАРАТУРА XIX СТ.

Ускладненне грамадскага, культурнага жыцця і духоўных пошукаў беларусаў. Станаўленне і развіццё новай беларускай літаратуры. Перыядызацыя. Шматмоўнасць. Спалучэнне рыс розных плыняў (класіцызм, рамантызм, рэалізм, сентыменталізм) у творчасці пісьменнікаў Беларусі XIX ст. Дзейнасць філаматаў і філарэтаў. Ананімная літаратура, яе змест і значэнне. Арыгінальнасць і нацыянальны каларыт твораў “Энеіда навыварат” і “Тарас на Парнасе”.

Рамантызм у беларускай літаратуры. Зварот да нацыянальнай гісторыі і выкарыстанне фальклору ў творчасці Я. Чачота, Т. Зана і інш. Вобразы рамантычных герояў у баладах і паэмах А. Міцкевіча (“Гражына”, “Дзяды”, “Конрад Валенрод”, “Свіцязь”, “Лілеі” і інш.). Тэмы, праблемы і мастацкія асаблівасці твораў. Паэма “Пан Тадэвуш”.

Фальклорна-міфалагічныя матывы і вобразы ў літаратурнай спадчыне Я. Баршчэўскага. Маральна-этычная і сацыяльна-грамадская праблематыка ў творчасці (“Шляхціц Завальня, або Беларусь у

фантастычных апавяданнях", "Драўляны Дзядок і кабета Інсекта", "Душа не ў сваім целе").

Жанрава-тэматычная разнастайнасць творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча ("Вечарніцы", "Купала", "Гапон", "Шчароўскія дажынкі" і інш.). В.І.Дунін-Марцінкевіч і станаўленне беларускага прафесійнага тэатра. Ідэйны змест, вобразная сістэма "Ідыліі" ("Сялянкі"). Крытычны пафас і сатыра ў фарсе-вадэвілі "Пінская шляхта". Сінтэз рамантызму, сентыменталізму, рэалізму ў творах В. Дуніна-Марцінкевіча.

Сацыяльны змест, мастацкія асаблівасці твораў У. Сыракомлі ("Паштальён", "Хадыка", "Ілюмінацыя" і інш.). Пераклады і апрацоўкі народных песень ("Жніўная песня", "Жменя пшаніцы" і інш.), навукова-мастацкія працы ("Вандроўкі па маіх былых ваколіцах" і інш.)

Паказ прыгонніцкай рэчаіснасці ў зборніку В. Каратынскага "Чым хата багата, тым і рада", паэме "Таміла".

Зараджэнне рэалістычнай плыні ў беларускай літаратуры XIX ст. Спалучэнне рыс розных плыняў у зборніках Ф. Багушэвіча "Дудка беларуская" і "Смык беларускі". Патрыятычны змест прадмоў. Спалучэнне нацыянальнай, сацыяльнай і маральнай праблематыкі ў паэзіі ("Бог не роўна дзеле", "У астрозе", "Быў у чыстцы", "Хрэсьбіны Мацюка", "Кепска будзе", "Афяра" і інш.). Жанр балады, байкі, апавядання. Значэнне асобы і творчасці.

## ТЭМА 5. ЛІТАРАТУРА ПАЧАТКУ XX СТ.

Асаблівасці грамадска-палітычных і сацыяльна-гістарычных ўмоў развіцця беларускай літаратуры пачатку XX ст. Дзейнасць суполкі "Загляне сонца і ў наша аконца" ў Пецярбургу, культурны рух у Вільні, першыя беларускія газеты "Наша доля" (1906) і "Наша ніва" (1906–1915) і выдавецтвы "Наша хатка", "Беларус" і інш. Беларуская літаратура "нашаніўскага" перыяду ў агульнаеўрапейскім культурным кантэксце. Роля Б. Эпімаха-Шыпілы, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, К. Каганца, Ядвігіна Ш., А. Гаруна, Цёткі, У. Галубка, С. Палуяна, З. Бядулі, В. Ластоўскага і інш. у станаўленні і развіцці новай беларускай літаратуры. "Паскоранасць" і складанасць літаратурнага працэсу. Традыцыі і наватарства ў беларускай літаратуры пачатку XX ст. Спецыфіка беларускага мадэрнізму.

Мастацкія асаблівасці "малой" прозы Ядвігіна Ш. Раман "Золата".

Творчасць Цёткі (А. Пашкевіч). Сацыяльна-рэвалюцыйныя, адраджэнскія матывы ў лірыцы ("Мора", "Хрэст на свабоду", "Добрыя весці", інш.). Псіхалагізм і гуманістычная скіраванасць прозы і публіцыстыкі Цёткі ("Прысяга над крывавымі разорамі", "Асеннія лісты", "Зялёнка", "Шануйце роднае слова" і інш.).

Рамантызм, сімвалізм, імпрэсіянізм і рэалізм у творчасці З. Бядулі. Зборнікі "Абразкі", "На зачараваных гонях". Тэмы і праблемы апавяданняў З. Бядулі ("Ашчаслівіла", "Малыя дрывасекі", "На каляды к сыну", "Малітва малога Габрусіка" і інш.). Тэма мастака і мастацтва

(апавяданні “Велікодныя яйкі”, “Бондар”, вершы “На горне душы першы верш я каваў…”, “Мары паэта”, аповесць “Салавей”). Аўтабіяграфізм у творах “Набліжэнне”, “У дрымучых лясах”.

Грамадска-палітычная, рэдактарска-выдавецкая, навуковая дзейнасць В. Ластоўскага. Жанравая разнастайнасць і інтэлектуалізм твораў пісьменніка (імпрэсіі, абразкі, апавяданні, аповесці). Канцэпцыя гісторыі, спалучэнне рэальнасці і фантастыкі ў аповесці “Лабірынты”.

Адраджэнскія матывы ў творчасці А. Гаруна. Пейзажная, інтымная і філасофская лірыка паэта (“Мая люба”, “Дзяўчаці”, “Навокал”, “Завіруха”, “Ідуць гады”, “Навука” і інш.). Ідэйна-мастацкі змест прозы (апавяданні “Першы снег”, “Пан Шабуневіч” і інш.).

Змест і структура зборніка “Вянок” М. Багдановіча. Рамантызм, сімвалізм і імпрэсіянізм у творчасці (“Возера”, “Слуцкія ткачыхі”, “Санет” (“Паміж пяскоў егіпецкай зямлі”), “Зорка Венера”, “Маёвая песня” і інш.). Міфалагічныя і народнапесенныя тэмы і матывы ў лірыцы. Адлюстраванне беларускай гісторыі, гуманістычны і патрыятычны пафас творчасці. Пейзажная і інтымная лірыка. Эстэтычныя погляды М.Багдановіча (“Музыка”, “Апокрыф”, “Песняру” “Псалтыр”). Героіка-рамантычныя паэмы “Максім і Магдалена” і “Страцім-лебедзь”. М. Багдановіч як перакладчык, крытык і гісторык літаратуры. Творчасць М. Багдановіча і музыка.

Праблематыка, агульны пафас зборнікаў Я. Купалы “Жалейка”, “Гусляр”, “Шляхам жыцця”, “Спадчына” і інш. Сацыяльна-філасофская, нацыянальна-патрыятычная, інтымная, пейзажная лірыка Я.Купалы. Спалучэнне рыс розных плыняў у творах. Асаблівасці сімволікі ў вершах (“Спадчына”, “Паязджане”, “О так! Я – пралетар!”, “А хто там ідзе”, “Смейся!”, “Маё цярпенне”, “Маладая Беларусь” і інш.). Тэмы і праблемы паэм Я.Купалы (“Адвечная песня”, “Курган”, “Сон на кургане”, “Безназоўнае”, “Зімою”, “На куццю”, “Адплата кахання”, “Нікому”, “Яна і я” і інш.). Тэма Радзімы ў творчасці пісьменніка. Уклад Я. Купалы ў развіццё драматургіі (“Паўлінка”, “Раскіданае гняздо”, “Тутэйшыя” і інш.). Перакладчыцкая і публіцыстычная дзейнасць. Роля Я.Купалы ў гісторыі беларускай літаратуры, развіцці нацыянальнай духоўнай культуры, музыкі, тэатра, мастацтва.

Зборнік Я. Коласа “Песні жальбы”: вобразы, матывы, праблемы. Тэма Радзімы і гістарычнага лёсу беларускага народа, ваенныя і рэвалюцыйныя падзеі ў творчасці Я. Коласа. Спецыфіка коласаўскай філасофскай казкі (зборнік “Казкі жыцця”). Фальклорныя і літаратурныя крыніцы твораў, жанравыя асаблівасці, філасофска-сацыяльны змест (“Жывая вада”, “Хмарка”, “Балотны агонь”, “Кажух старога Анісіма” і інш.). Праблематыка апавяданняў пачатку 1920-х гг. (“Сяргей Карага”, “Крывавы вір”, “Дачакаўся”). Ідэйна-мастацкі змест паэмы “Новая зямля”. Канцэпцыя мастака і мастацтва ў паэме “Сымон-музыка”. Элементы біяграфіі аўтара, адлюстраванне гістарычных падзей ў трылогіі “На ростанях”.

М. Гарэцкі як прадстаўнік інтэлектуальна-філасофскай прозы. Сімвалізм і рэалізм у творчасці. Тэма інтэлігенцыі і народа, адлюстраванне жыцця як нечага таемнага і страшнага ў ранніх творах (“Роднае карэнне”, “У лазні”, “Што яно?”, “Патаёмнае”, “Маці” і інш.). Праблема маральнага выбару, трагедыя “маленькага чалавека” ў апавяданнях пра вайну (“Рускі”, “Генерал”, “Літоўскі хутарок” і інш.). Маральна-філасофскі змест драматызаванай аповесці “Антон”. Спалучэнне дакументальнага і мастацкага (“На імперыялістычнай вайне”, “Камароўская хроніка”, цыкл “Сібірскія абразкі” і інш.). Лёс чалавека і лёс народа ў творах “Дзве душы”, “Фантазія”, “Апостал”, “Ціхая плынь” і інш.

## ТЭМА 6. ЛІТАРАТУРА 1920 – 30-Х ГГ.

Літаратурныя аб’яднанні “Маладняк”, “Узвышша”, “Полымя”, творчыя пошукі, наватарства іх прадстаўнікоў. Паняцце сацрэалізму. Рэвалюцыйна-рамантычны пафас, адмаўленне ад літаратурных традыцый, імкненне да стварэння новага мастацтва ў творчасці маладнякоўцаў (М. Чарот, А. Вольны, А. Дудар, Я. Пушча, К. Крапіва, К. Чорны, У. Дубоўка, М. Зарэцкі, П. Броўка і інш.). Зварот да літаратурнай класікі, імкненне стварыць нацыянальна-самабытную мастацкую літаратуру, арыентацыя на нацыянальнае як адметныя рысы творчай праграмы прадстаўнікоў аб’яднання “Узвышша” (З. Бядуля, К. Чорны, Я. Пушча, У. Жылка, П. Глебка, Т. Кляшторны, А. Мрый, Л. Калюга і інш.). Узнікненне аб’яднання “Полымя” (Я. Купала, Я. Колас, Ц. Гартны, М. Чарот, М. Зарэцкі і інш.) як спроба знайсці баланс паміж творчымі праграмамі “Маладняка” і “Узвышша”.

Грамадска-палітычныя і сацыяльна-гістарычныя ўмовы развіцця беларускай літаратуры 1930-х гг. Разгром беларускай пісьменніцкай арганізацыі, рэпрэсіі ў дачыненні да творцаў. Творчасць П. Галавача (кнігі “Спалох на загонах”, “Праз гады” і інш.), У. Галубка (п’есы “Ганка”, “Пан Сурынта”, “Пісаравы імяніны” і інш.), У. Дубоўкі (зборнікі “Строма”, “Credo“, “Наля”, “Палеская рапсодыя”, паэмы “Там, дзе кіпарысы”, “І пурпуровых ветразяў узвівы”), У. Жылкі (зборнікі “Вершы”, “Пожні” і інш.), Л. Калюга (аповесці “Ні госць, ні гаспадар”, “Нядоля Заблоцкіх” і інш.), Я. Пушчы (зборнік “Раніца рыкае”, вершаваны цыкл “Лісты да сабакі” і інш.) і іншых прадстаўнікоў літаратурных аб’яднанняў. Тэма рэпрэсій у творчасці беларускіх пісьменнікаў (Ф.Аляхновіч “У кіпцюрох ГПУ”, С.Грахоўскі “Зона маўчання”, Я.Брыль “Муштук і папка” і інш.)

Праблематыка сатырычнага рамана А. Мрыя “Запіскі Самсона Самасуя”. Мастацкія асаблівасці твора.

Псіхалагічная проза М. Зарэцкага Жанчына і новы сацыяльны лад у апавяданнях “Дзіўная”, “Кветка пажоўклая”, “Бель”. Спецыфіка канфлікту і праблематыка аповесці “Голы звер”. Майстэрства Зарэцкага-раманіста (“Вязьмо”, “Сцежкі-дарожкі”).

Уклад К. Крапівы ў развіццё беларускай байкі, нацыянальнай драматургіі і сатырычна-гумарыстычнай лірыкі і прозы. Тэматыка, праблематыка, асаблівасці вобразнай сістэмы баек. Жанравая разнастайнасць прозы К. Крапівы (зборнік апавяданняў “Людзі-суседзі“, раман “Мядзведзічы“). Сутнасць канфліктаў, мастацкая спецыфіка персанажаў у п’есах “Хто смяецца апошнім?”, “Мілы чалавек”. Ідэйны змест сацыяльна-філасофскай драмы “Брама неўміручасці”.

Псіхалагізм, філасофская скіраванасць апавяданняў К. Чорнага (зборнікі твораў “Апавяданні”, “Хвоі гавораць”, “Вераснёвыя ночы” і інш.). Мастацкая адметнасць і шматграннасць праблематыкі раманаў (“Зямля”, “Сястра”, “Бацькаўшчына”, “Пошукі будучыні”, “Млечны шлях” і інш.) Зварот да значных падзей у жыцці беларускага народа, філасофскія разважанні над месцам і прызначэннем чалавека ў свеце, разнастайнасць характараў персанажаў, гуманістычны пафас твораў.

## ТЭМА 7. ЛІТАРАТУРА ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ, ПЕРЫЯДУ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ. ТЭМА ВАЙНЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Асноўныя ідэалагічна-культурныя цэнтры і асаблівасці літаратурнага працэсу на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Заходнебеларускі друк (“Беларускія ведамасці”, “Беларускае жыццё”, “Звон”, “Калоссе”, “Нёман” і інш.). Літаратурна-філасофскае эсэ І. Канчэўскага “Адвечным шляхам”. Публіцыстыка А.Луцкевіча, Б.Тарашкевіча, М.Гарэцкага і інш.

Развіццё паэзіі. Багацце жанрава-эстэтычных пошукаў у творчасці М. Машары, В. Васілька, М. Танка, П. Пестрака, В. Таўлая, Н. Арсенневай, У. Жылкі, К. Сваяка, З. Верас і інш.

Драматургія Л. Родзевіча (зборнік вершаў “Беларусь”, п’есы “Збянтэжаны Саўка”, “Пакрыўджаныя” і інш.) і Ф. Аляхновіча (“Пан міністр”, “Новая драма”). Праявы мадэрнізму ў творах. Аўтабіяграфічная аснова аповесці Ф. Аляхновіча “У кіпцюрох ГПУ”.

Ідэйна-тэматычныя асаблівасці зборнікаў М. Танка “Журавінавы цвет”, “Пад мачтай”, паэм “Кастусь Каліноўскі”, “Нарач”, “Казка пра музыку” і інш. Творчасць М.Танка перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Характарыстыка пасляваенных зборнікаў “Каб ведалі”, “На камні, жалезе і золаце”, “У дарозе”. Праблематыка паэмы “Люцыян Таполя”. Жанравая і тэматычная разнастайнасць твораў ў зборніках “След бліскавіцы”, “Мой хлеб надзённы”, “Глыток вады”, “Дарога, закалыханая жытам” і інш. Інтэлектуалізм і філасофская скіраванасць паэзіі М. Танка. Зварот да гісторыі, да нацыянальнай і сусветнай культурнай і літаратурнай спадчыны, асвятленне актуальных праблем сучаснага грамадства ў паэзіі М.Танка 1980–1990-х гг. (зборнікі “Лірыка”, “Мой каўчэг”, “Errata”).

Перавага ў літаратуры перыяду вайны публіцыстычных жанраў (артыкулы Я. Коласа, К. Чорнага, К. Крапівы, М. Лынькова і інш.),

лірыкі (балада і вершы баладнага тыпу). Развіццё "малых" жанравых форм у беларускай мастацкай прозе. Паказ гераізму і патрыятызму савецкага чалавека. Зборнікі апавяданняў М. Лынькова "Астап", К. Чорнага "Вялікае сэрца". Вайна ў раманах К. Чорнага "Пошукі будучыні", "Млечны шлях".

Гераічна-патрыятычны пафас у паэзіі А. Куляшова ("Ліст з палону", "Ёсць пад старою Русаю…" і інш.), П. Панчанкі (зборнік "Іранскі дзённік"), П. Броўкі ("Рана", "Надзя, Надзейка" і інш.) і інш.

Тэма вайны ў літаратуры пасляваеннага перыяду (І. Мележ "Мінскі напрамак", І. Шамякін "Помста", "Глыбокая плынь", Я. Брыль "Птушкі і гнёзды" і інш.). Кніга-памяць "Я з вогненнай вёскі".

Роля В. Быкава ў раскрыцці тэмы вайны і іншых трагічных падзей савецкай гісторыі, экзістэнцыяльна-прытчавае гучанне яго твораў ("Мёртвым не баліць", "Жураўліны крык", "Круглянскі мост", "Сотнікаў", "Пакахай мяне, салдацік", "Ваўчыная яма", "Труба", зб. "Сцяна", "Пахаджане" і інш.). Адметнасць быкаўскага стылю. Экзістэнцыялізм і яго праявы ў творчасці пісьменніка.

Асаблівасці выяўлення тэмы вайны ў 70–80-я гг. Вайна ў жыцці і творчасці пісьменнікаў філалагічнага пакалення (І. Пташнікава, І. Чыгрынава, І. Навуменкі, В. Адамчыка і інш.), паэта-франтавіка А. Пысіна.

Аўтабіяграфізм дылогіі "Партызаны" А. Адамовіча. Дакументалізм, пастаноўка глабальных праблем часу ў творах ("Хатынская аповесць", "Карнікі" і інш.). Тэма атамнай вайны ("Апошняя пастараль"). А. Адамовіч і кіно.

## ТЭМА 8. ЛІТАРАТУРА ДРУГОЙ ПАЛОВЫ 50-Х – 60-Я ГГ.

Грамадска-палітычныя і маральна-этычныя праблемы, пераацэнка творчых здабыткаў і выпрацоўка новых эстэтычных крытэрыяў у творчасці паэтаў старэйшага пакалення. Арганічная спалучанасць нацыянальнага з агульначалавечым, сучаснасці з мінулым, беларускага фальклору з культурай сусветнай цывілізацыі ў творчасці М. Танка (зб. "Мой каўчэг", "Errata").

Роздум А. Куляшова над лёсам чалавека, народа, чалавечай цывілізацыі ("Новая кніга", "Цунамі", "Варшаўскі шлях", "Хамуціус" інш.). Навізна тэм у паэзіі.

Вечныя праблемы і своеасаблівасць іх мастацкага вырашэння ў паэзіі П. Панчанкі (зб. "І вера, і вернасць, і вечнасць", "Горкі жолуд", "Высокі бераг" і інш.). Грамадзянскае гучанне, сатырычная скіраванасць паэзіі, спавядальныя матывы.

Лірызацыя прозы як своеасаблівы каталізатар праўдзівасці ў мастацкай літаратуры, новае разуменне ролі асобы ў гісторыі, увага да духоўнага свету чалавека. Культура слова ў лірычнай прозе Я. Брыля, М. Стральцова і інш.

Развіццё аповесці і нарысу, актуалізацыя жанру беларускага рамана ў 60-я гг. Вайна і вёска як дзве магістральныя тэмы ў беларускай прозе.

Прыход у літаратуру "філалагічнага" пакалення пісьменнікаў (Н. Гілевіч, Г. Бураўкін, Р. Барадулін, Я. Сіпакоў і інш.). Тэматычная і жанрава-стылявая разнастайнасць, эстэтычнае абнаўленне літаратуры (узрастанне мастацка-аналітычнай глыбіні асэнсавання жыцця, часу, гісторыі, паварот да рэальных праблем рэчаіснасці, канфліктаў, узвышэнне маральна-этычнай каштоўнасці народнага жыцця, ідэалаў праўды і гуманізму).

## ТЭМА 9. ЛІТАРАТУРА 70 –80-Х ГГ.

Спроба пераадолення сацрэалістычнага падыходу ў літаратуры, змяншэнне пафаснага асэнсавання рэчаіснасці, роздум аб свеце і месцы асобы ў ім.

Актуалізацыя жанру аповесці і рамана. Традыцыі рэалізму, псіхалагічная заглыбленасць у прозе. Творчасць пісьменнікаў ваеннага пакалення (І. Навуменкі, І. Шамякіна і інш.) і пісьменнікаў пакалення "дзяцей вайны" (І. Пташнікава, В. Адамчыка, І. Чыгрынава і інш.). Мастацкае асэнсаванне "ваенна-вясковай" тэмы ў творчасці А. Карпюка, А. Кудраўца, А. Асіпенкі і інш. Раман-эпапея. "Палеская хроніка" І. Мележа як шматпланавае эпічнае адлюстраванне жыцця беларускай вёскі. Тэма калектывізацыі ў творы.

І. Шамякін як майстар рамана. Маральна-этычная праблематыка, спецыфіка канфліктаў ў творах "Крывінка", "Палеская мадонна", "Без пакаяння", "Сатанінскі тур" і інш.

Пашырэнне сродкаў і відаў псіхалагічнага аналізу. "Плынь свядомасці" ў беларускай літаратуры.

Лірычная проза і яе асаблівасці. Аналітызм і філасофская скіраванасць твораў Я. Брыля ("Ніжнія Байдуны", "Муштук і папка" і інш.).

Уклад У. Караткевіча ў беларускую паэзію, прозу і драматургію Неардынарнасць яго творчай асобы (літаратар, мастак, сцэнарыст, інш.). Культуралагічныя аспекты яго творчасці, сінтэз нацыянальнага і агульначалавечага ў ёй, зварот да гістарычнай тэматыкі (зб. "Матчына душа", "Вячэрнія ветразі", "Мая Іліяда", "Быў. Ёсць. Буду"; "Дзікае паляванне караля Стаха", "Чорны замак Альшанскі", "Ладдзя роспачы" і інш.). Асоба У. Караткевіча і сусветнае мастацтва.

Імкненне да творчага самавыяўлення, адстойванне ўласнага "я" і эстэтычнага пошуку ў паэзіі Я. Янішчыц, А. Пісьмянкова, К. Камейшы, В. Яраца і інш. Творчыя эксперыменты, інтэлектуалізм у паэзіі.

Жанрава-тэматычная разнастайнасць творчасці Н. Гілевіча (зб. "Актавы", "Жыта, сосны і валуны", "На высокім алтары", У віры быцця" і інш.). Ідэйна-мастацкі змест і праблематыка рамана "Родныя дзеці". Творчасць Н. Гілевіча і музыка.

Тэма Бацькаўшчыны, тэма памяці, міфалагічныя і біблейскія матывы, вобраз маці ў паэзіі Р. Барадуліна (зб. “Неруш”, “Свята пчалы”, “Евангелле ад мамы”, “Ксты” і інш.).

Жанрава-стылявая адметнасць творчасці Я. Сіпакова (зб. “Веча славянскіх балад”, “Тыя, што ідуць”, эсэ “Мая бібліятэка” і інш.).

Традыцыі і наватарства ў беларускай драматургіі. Актуальнасць твораў А. Макаёнка (“Выбачайце, калі ласка”, “Зацюканы апостал”, “Трыбунал”, “Таблетку пад язык”, “Святая прастата”, “Лявоніха на арбіце”, “Пагарэльцы” і інш.). Драмы А. Дударава (“Радавыя”, “Парог”, “Вечар”, “Чорная панна Нясвіжа”), камедыі К. Крапівы (“Брама неўміручасці”), М. Матукоўскага (“Амністыя”).

## ТЭМА 10. СУЧАСНЫ ЛІТАРАТУРНЫ ПРАЦЭС (ДРУГАЯ ПАЛОВА 80-Х ГГ. ХХ СТ. – ПАЧАТАК ХХІ СТ.)

Змены ў грамадска-палітычным жыцці ў другой палове 80-х гг. ХХ ст. і іх уплыў на развіццё літаратуры (вяртанне імёнаў і твораў, тэма адраджэння, грамадзянска-патрыятычныя і гістарычныя матывы, уключэнне ў літаратурны працэс твораў эмігранцкай літаратуры, інш.). Літаратурныя аб’яднанні канца ХХ ст. (“Тутэйшыя”, “ТВЛ”, “Бум-Бам-літ” і інш.). Спецыфіка беларускай постмадэрнісцкай літаратуры. Тэма чарнобыльскай катастрофы ў беларускай літаратуры (творчасць І. Шамякіна, Я. Сіпакова, М. Мятліцкага, А. Петрашкевіча і інш.).

Шматтэмнасць, мнагапланавасць праблематыкі, жанрава-стылявая разнастайнасць сучаснай прозы. Мастацка-дакументальная проза (А. Адамовіч, Я. Брыль, С. Грахоўскі, Л. Геніюш і інш.), гістарычная (Л. Дайнека, К. Тарасаў, А. Наварыч і інш.), фантастычна-прытчавая (Я. Сіпакоў, П. Місько і інш.), сацыяльная і псіхалагічна-філасофская (І. Шамякін, Ю. Станкевіч і інш.), прыгодніцка-дэтэктыўная і інш. Эксперыменты ў сферы форматворчасці і стылю. Гісторыя развіцця і сучасны стан беларускай фантастыкі. Антыутопія ў беларускай літаратуры (А.Адамовіч “Апошняя пастараль”, Ю. Станкевіч “П’яўка” і інш.). Сінтэз рэалістычнага і фальклорна-міфалагічнага ў прозе А. Казлова, Ф. Сіўко і інш.

Традыцыі і наватарства ў беларускай паэзіі, узбагачэнне ідэйна-тэматычнага зместу. Грамадзянска-публіцыстычнае гучанне лірыкі Н. Гілевіча, Г. Бураўкіна, М. Мятліцкага і інш. Рэлігійна-хрысціянскія матывы ў творчасці Р. Барадуліна, І. Багдановіч і інш. Жанравае і кампазіцыйнае абнаўленне паэзіі (хоку, трыялеты, вянкі санетаў, паліндромы, рубаі і інш., аўтарскія жанры).

Драматургічны вопыт А. Петрашкевіча, М. Матукоўскага, С. Кавалёва, П. Васючэнкі, М. Арахоўскага і інш.

Літаратура і новыя інфармацыйныя тэхналогіі.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

для студэнтаў спецыяльнасцей 6-05-0322-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць і 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

*(Дзённая форма атрымання адукацыі)*

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | семінар. заняткі | | |
| | Уводзіны | 2 | | | |
| | Тэма 1. Літаратура XI–XVI стст. | 4 | 2 | 2 | вуснае апытанне |
| | Тэма 2. Літаратура Адраджэння і Рэфармацыі | 6 | 2 | 2 | вуснае апытанне |
| | Тэма 3. Літаратура XVII – XVIII стст. | 4 | 2 | 2 | вуснае апытанне |
| | Тэма 4. Літаратура XIX ст. | 6 | 4 | 2 | вуснае апытанне |
| | Тэма 5. Літаратура пачатку XX ст. | 8 | 8 | 2 | рэфераты, вуснае апытанне |
| | Тэма 6. Літаратура 1920 – 30-х гг. | 4 | 6 | 2 | рэфераты, вуснае апытанне |
| | Тэма 7. Літаратура Заходняй Беларусі, перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Тэма вайны ў беларускай літаратуры | 4 | 4 | 2 | рэфераты, вуснае апытанне |
| | Тэма 8. Літаратура другой паловы 50-х – 60-я гг. | 4 | 4 | 2 | вуснае апытанне |
| | Тэма 9. Літаратура 70 –80-х гг. | 4 | 4 | 2 | вуснае апытанне |
| | Тэма 10. Сучасны літаратурны працэс (другая палова 80-х гг. XX ст. – пачатак XXI ст.) | 6 | 6 | 2 | рэфераты, вуснае апытанне |
| | Усяго | 52 | 42 | 20 | |

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

для студэнтаў спецыяльнасцей 6-05-0213-01 Мастацтвазнаўства, 6-05-0213-02 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, 6-05-0215-01 Музычная народная інструментальная творчасць, 6-05-0215-02 Музычнае мастацтва эстрады, 6-05-0215-03 Харэаграфічнае мастацтва, 6-05-0215-04 Рэжысура прадстаўленняў і свят, 6-05-0215-05 Рэжысура тэатра, 6-05-0215-06 Акцёрскае мастацтва, 6-05-0215-08 Мастацтва народных спеваў, 6-05-0215-09 Харавая творчасць, 6-05-0215-10 Камп'ютарная музыка, 6-05-0215-11 Фальклор, 6-05-0314-02 Культуралогія, 6-05-0314-03 Сацыяльна-культурны менеджмент і камунікацыі, 6-05-1013-02 Сацыяльна-культурная дзейнасць

*(Дзённая форма атрымання адукацыі)*

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | семінар. заняткі | | |
| 1 | Уводзіны | 0,5 | | | |
| 2 | Тэма 1. Літаратура XI–XVI стст. | 1,5 | | | |
| 3 | Тэма 2. Літаратура Адраджэння і рэфармацыі | 2 | | | |
| 4 | Тэма 3. Літаратура XVII – XVIII стст. | 2 | | | |
| 5 | Тэма 4. Літаратура XIX ст. | 2 | 2 | | |
| 6 | Тэма 5. Літаратура пачатку XX ст. | 2 | 2 | 2 | рэфераты, вуснае апытанне |
| 7 | Тэма 6. Літаратура 1920 – 30-х гг. | 2 | 2 | | |
| 8 | Тэма 7. Літаратура Заходняй Беларусі, перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Тэма вайны ў беларускай літаратуры | 2 | 2 | 2 | вуснае апытанне |
| 9 | Тэма 8. Літаратура другой паловы 50-х – 60-я гг. | 2 | 2 | 2 | вуснае апытанне |
| 10 | Тэма 9. Літаратура 70 –80-х гг. | 2 | | | |
| 11 | Тэма 10. Сучасны літаратурны працэс (другая палова 80-х гг. XX ст. – пачатак XXI ст.) | 2 | 2 | 2 | рэфераты, вуснае апытанне |
| | **Усяго** | 20 | 12 | 8 | |

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

для студэнтаў спецыяльнасці
6-05-0322-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць
*(Завочная форма атрымання адукацыі)*

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | семінарскія заняткі |
| 1 | Уводзіны | 1 | |
| 2 | Тэма 1. Літаратура XI–XVI стст. | 2 | |
| 3 | Тэма 2. Літаратура Адраджэння і Рэфармацыі | 2 | |
| 4 | Тэма 3. Літаратура XVII – XVIII стст. | 1 | |
| 5 | Тэма 4. Літаратура XIX ст. | 2 | |
| 6 | Тэма 5. Літаратура пачатку XX ст. | 2 | 2 |
| 7 | Тэма 6. Літаратура 1920 – 30-х гг. | 2 | |
| 8 | Тэма 7. Літаратура Заходняй Беларусі, перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Тэма вайны ў беларускай літаратуры | 2 | 2 |
| 9 | Тэма 8. Літаратура другой паловы 50-х – 60-я гг. | 2 | 2 |
| 10 | Тэма 9. Літаратура 70 –80-х гг. | 2 | |
| 11 | Тэма 10. Сучасны літаратурны працэс (другая палова 80-х гг. XX ст. – пачатак XXI ст.) | 2 | 2 |
| | Усяго | 20 | 8 |

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

для студэнтаў спецыяльнасцей 6-05-0213-01 Мастацтвазнаўства, 6-05-0213-02 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, 6-05-0215-01 Музычная народная інструментальная творчасць, 6-05-0215-02 Музычнае мастацтва эстрады, 6-05-0215-03 Харэаграфічнае мастацтва, 6-05-0215-04 Рэжысура прадстаўленняў і свят, 6-05-0215-05 Рэжысура тэатра, 6-05-0215-06 Акцёрскае мастацтва, 6-05-0215-08 Мастацтва народных спеваў, 6-05-0215-09 Харавая творчасць, 6-05-0215-10 Камп'ютарная музыка, 6-05-0215-11 Фальклор, 6-05-0314-02 Культуралогія, 6-05-0314-03 Сацыяльна-культурны менеджмент і камунікацыі, 6-05-1013-02 Сацыяльна-культурная дзейнасць

*(Завочная форма атрымання адукацыі)*

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі |
| 1 | Уводзіны | 1 | |
| 2 | Тэма 1. Літаратура XI–XVI стст. | 1 | |
| 3 | Тэма 2. Літаратура Адраджэння і рэфармацыі | 1 | |
| 4 | Тэма 3. Літаратура XVII – XVIII стст. | 1 | |
| 5 | Тэма 4. Літаратура XIX ст. | 1 | |
| 6 | Тэма 5. Літаратура пачатку XX ст. | 1 | |
| 7 | Тэма 6. Літаратура 1920 – 30-х гг. | 1 | |
| 8 | Тэма 7. Літаратура Заходняй Беларусі, перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Тэма вайны ў беларускай літаратуры | 1 | |
| 9 | Тэма 8. Літаратура другой паловы 50-х – 60-я гг. | | 2 |
| 10 | Тэма 9. Літаратура 70 –80-х гг. | 1 | |
| 11 | Тэма 10. Сучасны літаратурны працэс (другая палова 80-х гг. XX ст. – пачатак XXI ст.) | 1 | |
| | **Усяго** | 10 | 2 |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

*Асноўная*

1. Гісторыя беларускай літаратуры, XIX - пачатак XX ст. : падручнік для студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей вышэйшых педагагічных навучальных установ / І. Э. Багдановіч, Гніламёдаў, Уладзімір Васільевіч, Казбярук, Уладзімір Міхайлавіч ; пад агул. рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. – Выд. 2-е, дапрац. – Мінск : Вышэйшая школа, 1998. – 559, [1] с.

2. Гісторыя беларускай літаратуры. Старажытны перыяд : падручнік для студэнтаў філалагічных факультэтаў педагагічных вну / М. М. Грынчык [и др.] ; пад агул. рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. – Выд. 4-е, стэр. – Мінск : Вышэйшая школа, 1998. – 349, [2] с.

3. Старажытная беларуская літаратура / [уклад. УП "Выдавецтва "Вышэйшая школа"]. – Мінск : Вышэйшая школа, 2022. – 368 с.

*Дадатковая*

1. Баршчэўскі, Л. Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён: папулярныя нарысы / Л.Баршчэўскі, П.Васючэнка, М.Тычына. – Мінск : Радыёла–плюс, 2006. – 574 с.

2. Бельскі, А. І. Сучасная беларуская літаратура: станаўленне і развіццё творчых індывідуальнасцяў (80–90 гг.): вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў / А.І.Бельскі. – Мінск : Нар. асвета, 1997. – 254 с.

3. Васючэнка, П.В. Сучасная беларуская драматургія: дапам. Для настаўнікаў / П.В.Васючэнка. – Мінск: Мастац. літ., 2000. – 156 с.

4. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: У 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я.Купалы; Навук. рэд.: І.Я.Навуменка, В.А.Каваленка. – Мінск : Бел. навука, 1999–2015. – 4 т.

5. Гісторыя беларускай літаратуры, XI – XIX стст.: у 2 т. / НАН Беларусі, Ін-т імя Я. Купалы; навук. рэд. В. А. Чамярыцкі. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2006–2007. – 2 т. Гісторыя беларускай літаратуры: XX стагоддзе (20-50-я гг.): Падруч. для студэнтаў філал. спец. ВНУ / У.В.Гніламёдаў, В.В.Казлова, М.А.Лазарук і інш.; Пад агул. рэд. М.А.Лазарука, А.А.Семяновіча. – Мінск: Выш. шк., 2000. – 510 с.

6. Гісторыя беларускай літаратуры, XIX – пач. XX ст.: падручнік для філал. фак. пед. ін-таў БССР / Л. С. Голубева [і інш.]; пад агул. рэд. М.А. Лазарука, А. А. Семяновіча. – Мінск : Выш. школа, 1981. – 412 с.

7. Дасаева, Т.М. Беларуская літаратура XX – пачатку XXI стагоддзя: вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях “Журналістыка міжнародная”,

“Журналістыка (па напрамках)”, “Літаратурная работа (па напрамках)”, “Інфармацыя і камунікацыя”, “Беларуская філалогія” / Т.М. Дасаева. – Мінск: РІВШ, 2016. – 263 с.

8. Кісліцына, Г.М. Новая літаратурная сітуацыя: змена культурнай парадыгмы. Навуковае выданне. – Мінск: Логвінаў, 2006. – 415 с.

9. Кісялёў, Г. Ад Чачота да Багушэвіча / Г.Кісялёў. – 2-е выд. – Мінск: Мастац. літ., 2003. – 426 с.

10. Лойка, А. А. Старабеларуская літаратура: Падруч. для філал. спец. ВНУ / А.А.Лойка. – Мінск: Выш. шк., 2001. – 318 с.

11. Лойка, А. А. Гісторыя беларускай літаратуры: дакастрычніцкі перыяд: падручнік для філал. фак. выш. навуч. Установ БССР: у 2 ч. / А. А. Лойка. – Мінск: Выш. школа, 1977–1980. – 2 ч.

**Дадатковая біяграфічна-даведачная літаратура**

1. Адамовіч, А. Браму скарбаў сваіх адчыняю… : даследаванне жыцця і творчасці М. Гарэцкага / А.Адамовіч. – Мінск : БДУ, 1980. – 223 с.

2. Беларускія пісьменнікі; [пад рэдакцыяй А. В. Мальдзіса]: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы Акад. навук Рэсп. Беларусь, Беларус. энцыкл. – Мінск : БелЭн, 1992–1995. – 6 т.

3. З росных сцяжын: аўтабіяграфіі пісьменнікаў Беларусі / Уклад. М.Мінзер. – Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2009. – 460 с.

4. Максім Багдановіч. Пясняр чыстае красы: успаміны, артыкулы, прысвячэнні / [уклад. Т. Шэляговіч]. – Мінск: Мастац. літ., 2011. – 349 с. – (Жыццё знакамітых людзей Беларусі : ЖЗЛБ).

5. Пяцьдзесят чатыры дарогі: Аўтабіягр. беларус. пісьменнікаў / Склад. І падрыхт. Тэкстаў Я.Казекі. – Мінск : Мастац. літ., 1963. – 551 с.

6. Уладзімір Караткевіч. Быў. Ёсць. Буду!: успаміны, інтэрв’ю, эсэ / укладанне Г.Шаблінскай. – Мінск : Мастац. літ., 2005. – 517 с. – (Жыццё знакамітых людзей Беларусі : ЖЗЛБ).

7. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. / рэдкал.: І.П.Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1984–1987. – 5 т.

8. Янка Купала: энцыкл. Даведнік / Беларуская сав. энцыкл.; рэдкал.: І.П.Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1986. – 727 с.

9. Куляшова, В.А. Аркадзь Куляшоў. Лясному рэху праўду раскажу...: аповесць-эсэ / Валянціна Куляшова. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2014. – 260 с.

10. Калядка, С.У. Максім Танк. Новыя факты, матэрыялы, інтэрпрэтацыі : [манаграфія] / С. У. Калядка ; [навук. рэд.: А. Л. Верабей, Л. Г. Кісялёва]. – Мінск: Беларуская навука, 2014. – 483с.

11. Кузьма Чорны. Чалавек – гэта цэлы свет: успаміны, эсэ, артыкулы, інтэрв'ю, дакументы / [уклад. Галіна Шаблінская]. – Мінск:

Мастацкая літаратура, 2016. – 510 с. (Жыццё знакамітых людзей Беларусі).

**Хрэстаматыі**

1. Анталогія даўняй беларускай літаратуры / пад рэд. В.Чамярыцкага. – Мінск: Выш. шк., 2003. – 1015 с.

2. Літаратура XI–XVI стагоддзяў / Уклад. і камент. А. У. Бразгунова, І. У. Будзько, Л. В. Ляўшун ; прадм. У. В. Гніламёдава; навук. рэд. В. А. Чамярыцкі. – Мінск : Маст. літ., 2011. – 765 с. – (Залатая калекцыя беларускай літаратуры).

3. Літаратура XVII–XVIII стагоддзяў / Уклад. А.У.Бразгунова, С.Л.Гараніна; навук. рэд. В.А.Чамярыцкі. – Мінск : Маст. літ., 2012. – 830 с. – (Залатая калекцыя беларускай літаратуры).

4. Старажытная беларуская літаратура (XII–XVII стст.) / уклад., прадм., камент. І.Саверчанкі. – Мінск : Кнігазбор, 2007. – 608 с.

5. Старажытная беларуская літаратура : Зборнік : Для ст. шк. узросту / уклад. Л.С.Курбека; аўт. Прадм. У.Г.Кароткі. – Мінск : Юнацтва, 1990. – 350 с.

6. Сучасная беларуская драматургія: Традыцыі і наватарства / уклад. П.Васючэнка. – Мінск: Маст. літ., 2003. – 639 с.

7. Сучасная беларуская п’еса: Зб. / склад. Г.Марчук. – Мінск: Маст. літ., 1992. – 396 с.

8. Сучасная беларуская п’еса: Зб. / склад. П.Васючэнка. – Мінск: Маст. літ., 1997. – 302 с.

9. Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі: у 3 т. / Беларус. ун-т культуры; уклад., рэд. тэкстаў, уступ. Арт. І камент. А.В.Сабалеўскага. – Мінск : Беларус. навука, 1997. – 3 т.

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі кампетэнцый студэнта

Ацэнка ведаў і ўменняў студэнтаў выконваецца паэтапна і ўключае апытанне на семінарскіх занятках па вызначанай тэме вучэбнай дысцыпліны і выніковы кантроль у форме заліку ці экзамену. Для ажыццяўлення бягучага кантролю і самакантролю кампетэнцый студэнтаў па дысцыпліне “Беларуская літаратура” можна выкарыстоўваць вусныя і пісьмовыя адказы на пытанні, тэсціраванне, творчыя працы, напісанне рэфератаў, падрыхтоўку дакладаў і прэзентацый, інш.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Састаўным элементам прафесійна арыентаванага навучання з’яўляецца самастойная работа, якая ўключае разнастайныя віды пазааўдыторнай работы студэнта. Прадугледжваюцца такія формы работы, як стварэнне літаратурнага дзённіка, выкананне індывідуальных заданняў праблемнага характару, напісанне творчых работ, падрыхтоўка прэзентацый і інш.

Кантроль за выкананнем самастойнай работы з’яўляецца бягучым і ажыццяўляецца праз e-mail, індывідуальныя кансультацыі, на семінарскіх і лекцыйных занятках, падчас заліку ці экзамену.

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

| Балы | Крытэрыі ацэнкі |
|---|---|
| 1 (адзін), не залічана | Адсутнасць ведаў і кампетэнцый у рамках вучэбнага курса; адмаўленне ад адказу |
| 2 (два), не залічана | Фрагментарныя веды ў межах вучэбнага курса; наяўнасць у адказе грубых, лагічных памылак |
| 3 (тры), не залічана | Недастаткова поўны аб'ём ведаў у межах вучэбнага курса; фрагментарны пераказ тэксту; няўменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію і арыентавацца ў тэорыі літаратурнага працэсу |
| 4 (чатыры), залічана | Валоданне зместам твора пераважна на ўзроўні пераказу, адсутнасць канцэптуальнага ўспрымання літаратурнага працэсу; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі |
| 5 (пяць), залічана | Дастатковы ўзровень ведаў у рамках вучэбнай праграмы; эмацыянальнае асэнсаванне тэксту са спробай ацаніць характары і сітуацыі; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі і арыентацыя ў тэорыі літаратурнага працэсу; лагічны адказ і здольнасць рабіць высновы; засваенне асноўнай літаратуры |
| 6 (шэсць), залічана | Дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі і арыентацыя ў тэорыі літаратурнага працэсу; раскрыццё зместу літаратурнага твора праз выяўленне праблематыкі, вобразнай сістэмы; спроба раскрыць аўтарскія адносіны да герояў і падзей пры адсутнасці аналітычнага падыходу; лагічны адказ і здольнасць рабіць высновы; засваенне асноўнай літаратуры |
| 7 (сем), залічана | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі і арыентацыя ў тэорыі літаратурнага працэсу; добрае валоданне тэкстам, уменне аналізаваць твор на ідэйна-кампазіцыйным узроўні; здольнасць рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні; лагічны і разгорнуты адказ; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры |
| 8 (восем), залічана | Сістэматызаваныя, грунтоўныя і трывалыя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы; свабоднае валоданне навуковай тэрміналогіяй і арыентацыя ў тэорыі літаратурнага працэсу; разуменне і раскрыццё шматузроўневасці мастацкага твора; выкарыстанне цытат; самастойнасць высноў; валоданне метадамі комплекснага аналізу; адказ на дадатковыя пытанні; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры |
| 9 (дзевяць), залічана | Сістэматызаваныя, грунтоўныя і трывалыя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы; свабоднае валоданне навуковай тэрміналогіяй і арыентацыя ў тэорыі літаратурнага працэсу; уменне аналізаваць твор у адзінстве зместу і формы; прадуманы, лагічны, разгорнуты, абгрунтаваны адказ, які не патрабуе дадатковых пытанняў; поўнае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры |
| 10 (дзесяць), залічана | Сістэматызаваныя, грунтоўныя і трывалыя веды па ўсіх раздзелах праграмы; свабоднае валоданне навуковай тэрміналогіяй і арыентацыя ў тэорыі літаратурнага працэсу; уменне даваць тыпалагічны аналіз, рабіць арыгінальныя высновы; выяўленне аўтарскай канцэпцыі жыцця і асобы; творчая інтэрпрэтацыя тэксту; поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры |